*Анастасія Гулак*

# НАВУКОВАЯ СПАДЧЫНА А.КІРКОРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАГА ЭТНАКУЛЬТУРНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

Сучаснае этнакультурнае выхаванне ў сістэме вышэйшай школы Беларусі немагчыма без сістэмнага засваення гісторыі развіцця беларусазнаўства. Вывучэнне міфалагічнага кірунку - першага ў гісторыі фальклярыстыкі - актуальнае для эфектыўнага навучальнага працэсу, паколькі адукацыйныя стандарты па шэрагу спецыяльнасцей ВНУ прадугледжваюць вывучэнне яе гісторыі. Гэта вывучэнне ўключае: этапы станаўлення беларускай фальклярыстыкі, перыядызацыю збірання і навуковага вывучэння фальклору, асноўныя кірункі і школы ў фальклярыстыцы XIX-XX стст., метады і прынцыпы вывучэння фальклору, працы вядучых фапьклярыстаў, асноўныя працы даследчыкаў міфалогіі, гісторыю міфалогіі як навукі[24].

Менавіта ў XIX ст. у нарадазнаўчым вывучэнні славян *даследаванні архаічных пластоў народнай культуры* ўпершыню займаюць галоўнае месца. Інтэрпрэтацыя з'яў традыцыйнай культуры ў міфалагічных даследаваннях вымагае шырокага вывучэння і аналізу літаратуры, адбору эмпірычных дадзеных, назапашаных да сярэдзіны XIX ст. Пры тым, што кола аб'ектыўных і поўных крыніц па міфалогіі славян было нязначнае, істотную гнасеалагічную функцыю ў даследаваннях міфолагаў пачынаюць адыгрываць новыя дадзеныя. Асэнсаванне новых фактаў, адкрыццё новых крыніц выразна выяўляецца ў спадчыне яркага прадстаўніка міфалагічнага кірунку ў беларускай фальклярыстыцы, краязнаўцы і археолага А. Кіркора. Знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы А. Кіркор падрыхтаваў паводле праграмы РГТ працу «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1857-59), якая з'яўляецца асноўнай крыніцай для рэканструкцыі міфалагічных поглядаў даследчыка.

У тэзісах, выкладзеных у «Этнаграфічным поглядзе на Віленскую губерню» назіраецца ўплыў «салярнай» і «метэаралагічнай» тэорыі міфолагаў М. Мюлера (Max Miiller; 1823 - 1900) і А. Куна (Franz Felix Adalbert Kuhn; 1812 - 1881). Уплыў «салярнай» тэорыі выражаны найперш у тым, што найбольшы міфалагічна- абрадавы сэнс А. Кіркор надае пераходным кропкам календара: зімовы сонцаварот / барацьба дабра і зла, святла і цемры, увасобленая ў змаганні *Перуна* з *Сыціўратам / Карачуном* [4. с. 252]. У текстах А. Кіркора няма спасылак на даследаванні нямецкіх міфолагаў, аднак на гэта ўказвае шэраг яго тэзісаў: маланка / *Грамауніца, Цёця*, жонка *Перуна*; сіла холаду і зімы / воўк; мяцеліцы / ваўчыныя зграі; матыў «паварочвання сонца» / паварочванне мядзведзя ў бярлогу; арыйская ахвяра богу - Сонцу / дзік, свіння [4, с. 251-252].

Наогул прынцып супастаўлення антычных і германскіх / славянскіх багоў упершыню быў зафіксаваны яшчэ ў сярэднявечных хроніках. Ён рэалізаваны ў энцыклапедычным слоўніку Mater Verborum (XIII), у хроніцы Адама Брэменскага «Дзеянні архіепіскапаў Гамбургскай царквы» (Gesta Hammaburgensis ecclesiae pontificum; XI). Падобныя інтэрпрэтацыі з'явіліся асноўным тэарэтыка-метадалагічным прынцыпам міфолагаў. Напрыюіад, семантычна-функцыянальнае поле *Сыціўрата (Sytiwrat*), паводле А. Кіркора, атаясамлівае яго з грэчаскім *Кронасам*, як персаніфікацыяй ідэі часу [4, с. 252]. Славянскі корань *-врат-*, відавочна, абумоўлівае рэмінісйэнцыі з вобразам паварочвання сонечнага кола, што семантычна апраўдвае знаходжанне *Сыціўрата* ў калядным цыкле. Свята Грамніцы, нагадвае А. Кіркору «язычніцкае ачышчэнне агнём (Februa)»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[34] ОСРБ 1-02 02 04-2008 Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць - 1-02 02 04 Сусветная і айчынная культура. Фальклор.
ОСРБ 1-02 03 01-2008 Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць - 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.
ОСРБ 1-18 01 01-2008 Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках).
ОСРБ 1-21 05 04-2008 Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 05 04 Славянская філалогія.
ОСРБ 1-21 05 01-2009 Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках).

і параўноўваецца ім са старажытнарымскімі рытуаламі ў гонар багіні жывёлагадоўлі Pales, што ўключалі спаленне, ахвярапрынашэнне агню, скокі праз агонь. *Масленіца* - «тыя ж Сатурналіі і Вакханаліі ў Беларусі» [4, с. 256]. *Лешы* (укр. *Полісун, Лісовік)* - казланогі *Пан,* ваўчыны пастыр [4, с. 271]. «*Пярун,* - піша А. Кіркор, - магутны цар нябесны, якому *Белабог* даручыў нябесны молат, каб весці адвечную барацьбу з *Чарнабогам* і яго бясоўскім войскам, жыве ў памяці ўсіх славянаў і літоўцаў. Ён цалкам адпавядае *Індры* індыйцаў, *Зеўсу* грэкаў, *Тору* германцаў» [4, с. 267]. Тэонім *Белабог* сустракаецца ў славянская фразеалогіі і фальклоры. Падставай рэканструкцыі *Белабога* папярэднікамі А. Кіркора, найперш - А. Афанасьевым, з'яўляюцца дадзеныя «Славянскай хронікі» (Chronicon Slavorum; XII—XIII) Гельмальда (Helmold). Шэраг вучоных, у прыватнасці
Н. Талстой, указваючы на тое, што ў хроніцы названы «нейкі добры бог, што супрацьстаіць *Чарнабогу*», лічаць вобраз *Белабог*а ўзніклым пад уплывам літаратурных рэмінісцэнцый ці познім запазычаннем з нямецкай міфалогіі [5], [1, с. 151]. Пастуліраванне апазіцыі *Белабога / Чарнабога* як дуалістычнага ўяўлення аб свеце з'яўлецца, на думку В. Тапарова, маладаставерным. Гэтыя боствы ўзгадваюцца ў літаратуры XVIII-XIX стст., якая з'яўляецца крыніцай другаснай. М.М. Хераскаў увёў названых *Белабога / Чарнабога* і шэраг іншых славянскіх бостваў у паэме «Уладзімір адроджаны» (1785), М.М. Карамзін - у «Гісторыі дзяржавы Расійскай» (тамы 1—12, 1803—1826 гг.). Звярнем увагу на тое, што А. Кіркор адзначае: «Пра *Чарнабога* мы не сустрэлі нідзе прамых указанняў. Здаецца, што *Зюзя* цалкам заступіў яго месца. Здаецца, адны паморцы яўна пакланяліся *Чарнабогу,* не менш за іх славяне баяліся *Чарнабога * таемна прыносілі яму ахвяры. З пашырэннем хрысціянскіх паняццяў *Чарнабог* канчаткова змяніўся на чорта, а ў Беларусі, як ва ўсіх славянаў, захавалася прыказка: «І Бога хвалі, і чорта не гняві» [4, с. 273].

А. Кіркор даследаваў міфалогію не толькі на матэрыяле празаічных фальклорных жанраў, але ўключыў у крыніцазнаўчую базу і апісанні каляндарных абрадаў, звычаяў, часткова тэксты песень. У багацці міфалагічнай спадчыны беларусаў, паралельнай, на думку аўтара, па старажытнасці толькі з сербскай ці балгарскай, пераконваюць «абрадавыя звычаі, што хаваюць у сабе шмат ніцей, якія звязваюць сучаснасць з найаддаленым мінулым» [4, с. 251].

Крыніцазнаўчая база даследавання славянскіх старажытнасцей пашырылася. Гэтаму спрыяла прыцягненне краязнаўчых ведаў. Пашырэнне выразілася ў адкрыцці А. Кіркорам тапанімічных паданняў гістарычнага зместу. Ён адзначаў, што старажытных паселішчаў, вечавых сходбішчаў, судзілішчаў, месцаў ахвярапрынашэнняў, месцаў сходаў вакольных жыхароў у выпадку нападзення ворагаў у Беларусі шмат. Такія звесткі, аздобленыя ўзорамі народных твораў, паведамлялі К. Тышкевіч, А. Плятэр. Многія варыянты, прыведзеныя ў нарысах «Жывапіснай Расіі», з'яўляюцца арыгінальнымі варыянтамі: паданне пра Князь- возера і замак князёў Слуцкіх-Алелькавічаў [4, с. 334], паданне пра царкоўны звон, якое адносіцца да часоў Паўночнай вайны [4, с. 331], паданні пра Магілёў часоў Паўночнай вайны: захоп горада войскамі Карла XII і Пятра I [4, с. 407], паданне пра Дуброўну на Аршаншчыне [4, с. 415], паданне пра гару Рагнеды на Полаччыне [4, с. 248], паданні пра Крычаў [4, с. 421], паданні пра Тураў [4, с. 379], паданне пра Дзмітрыя Янчына, уладальніка Прапойска [4, с. 424]. Матывы скамянення, ухода пад зямлю / ваду, вядзьмарства, скрадзення нехрышчоных дзяцей, матывы невыканальных заданняў, цудоўных ахоўнікаў прысутнічаюць у названых творах. Іх семантыка выяўляе сувязь з міфам. «Часам немагчыма раздзяліць міф і гістарычнае паданне, - піша Т. Шамякіна. - Легенды, успаміны, хаджэнні, жыціі, хранікальныя запісы напежаць да гістарычных апісанняў, але ўзыходзяць да міфапаэтычнай творчасці» [7, с. 159].

Галоўнымі высновамі па спадчыне А. Кіркора для засваення ў кантэксце этнакультурна- выхаваўчага працэсу з'яўляюцца наступныя.

1. Як міфолаг А. Кіркор не ставіў мэты рэканструяваць міфалогію як тып культуры, заснаваны на архаічных формах ментальнасці, што абумоўлена аб'ектыўным станам народазнаўчай навукі XIX ст.

2. Ён істотна пашырыў крыніцазнаўчую базу міфалагічнага даследавання, уключыўшы ў яе апісанні абрадаў, павер'яў, абрадавых рэгламентацый, празаічныя і песенныя жанры, а таксама дадзеныя археалогіі і краязнаўства.

3. Міфалагізм тэкстаў А. Кіркора мае не рэтраспектыўную скіраванасць, ён зарыентаваны на сцвярджэнне ў тагачаснай навуцы і сацыяльнай сферы ідэі ўнікальнасці і самабытнасці народнай культуры беларусаў.

**Спіс літаратуры:**


I. Янчук, Н.А. А.К. Киркор: Краткий очерк жизни и деятельности / сост. Н. Янчук. - М.: Тип. А. И. Мамонтова и К, 1888. - 29 с.

2. Пыпин, А. Н. История русской этнографии: в 4 т. / А.Н. Пыпин. - СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1890-1892. - Т. 4: Белоруссия и Сибирь. - 1892.-488 с.

3. Цішчанка, І. К. Да народных вытокаў : Збіранне і вывучэнне бел. фальклору ў 50-60-я гг. XIX ст. / І.К. Цішчанка. - Мінск : Навука і тэхніка, 1986. - 246 с.

4. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт, воспроизведение изд. 1882 г. - Мінск: БелЭн, 1993. -550 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Славянские древности: Этнолингв. словарь : В 5 т. / под ред. Н.И. Толстого. - М.: Междунар. отношения, 1995. Т. 1: А - Г / Т.А. Агапкина, Л.Н. Виноградова, А.В. Гура и др. - 578 с. - Т. 2: Д - К (Крошки) / Т.А. Агапкина, О.В. Белова, М.М. Валенцова и др. - 697 с. Т. 3: К (Круг) - П (Перепелка) / Т.А.Агапкина, О. В. Белова, М.М.Валенцова и др. - 697 с.
6. Шамякіна, Т.І. Славянская міфалогія: курс лекцый для студэнтаў-філолагаў спецыяльнасцей 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія» / Т.І. Шамякіна. - Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2005. - 155 с.
7. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі: Нарысы : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / Т.І. Шамякіна. - Мінск : Выд. рэсп. унітар. прадпрыемства «Маст. літ.», 2000. - 398, [1] с.
8. Мифы народов мира: энциклопедия: В 2 т. / под ред. С.А. Токарева. - М.: Большая Российская энциклопедия, 1987-1988. Т. I: А-К.-671 е.; Т. 2:К-Я.-719с.
9. Смирнов, М.Ю. Мифологическое сознание и религия : Теоретико-методол. исслед.: автореф. дис. на соиск. учен. степ, д-ра филос. наук : 09.00.13 / М.Ю. Смирнов. - СПб. гос. ун-т, СПб.: 2002. -44 с.
10. Судник Т.М., Цивьян, Т.В. К реконструкции сюжета основного мифа в балто-балканской перспективе (фрагмент «Жена и дети громовержца») // Этнолингвистические балто-славянские контакты в настоящем и прошлом : конф., 11-15 дек. 1978 г. : предвар. материалы / редкол.: В.В. Иванов и др.-М.: Наука, 1978.-С. 124-131.
11. Топорков, A.JI. Об источниках «поэтических воззрений славян на природу» / А.Л.Топорков, А.Афанасьев. Поэтические воззрения славян на природу : справ.-библиогр. материалы / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения. - М.: Индрик, 2000. - С. 7-50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ